# РАШЭННІ ПЛЕНУМА ЦК КПСС— У ЖЫЦЦЁ

Партыйная арганізацыя гістарычнага факультэта абмеркавала рашэнні кастрычніцкага Пленума ЦК КПСС і лістападаўскага Пленума ЦК Кампартыі Беларусі і вызначыла сваё месца ў іх выкананні. З дакладам па гэтаму пытанню на сходзе выступіла член партбюро старшы выкладчык Е. А. Даўгучыц. Яна падрабязна ахарактарызавала сучаснае становішча сельскай гаспадаркі ў краіне, расказала аб тых мерапрыемствах, якія праводзіла і праводзіць партыя па выкананню рашэнняў XXIII з'езда КПСС у галіне сельскагаспадарчай вытворчасці. У дакладзе сфармуляваны канкрэтныя задачы гістфака. Яны былі канкрэтызаваны і дапоўнены выступіўшымі ў спрэчках. Так, дацэнт кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў А. А. Малашка прызваў вучоных-гісторыкаў глыбей і шырэй вывучаць змены, якія адбываюцца цяпер у вёсцы. На яго думку, тэмы курсавых і дыпломных работ студэнтаў таксама трэба перагледзець у святле патрабаванняў Пленума ЦК КПСС.

Сход падтрымаў таксама прапанову кандыдата эканамічных навук М. І. Базылева далей развіваць шэфскую работу гісторыкаў на сяле. Некалі факультэт шэфстваваў над Дзяржынскім раёнам Мінскай вобласці, быў набыт станоўчы вопыт у лекцыйнай прапагандзе, у дапамозе вясковай моладзі ў арганізацыі культурнага адпачынку. Цяпер ёсць магчымасці весці гэтую работу на больш высокім узроўні. Скажам, чаму летняй парой не стварыць студэнцкія лагеры і атрады, якія размесцяцца ў калгасах, будуць удзельнічаць у вытворчасці (карысць сабе і людзям), дапамагаць у арганізацыі мастацкіх гурткоў, развіцці фізкультуры і спорту на вёсцы і г. д. Ёсць жа ў нас студэнцкія будаўнічыя атрады.

Камуністы даручылі камітэту камсамола рэалізаваць гэтую прапанову. Наогул у прынятай сходам пастанове шмат цікавых мерапрыемстваў, якія накіраваны на ўзмацненне і развіццё сувязей факультэта і універсітэта ў цэлым з хлебаробамі, жывёлаводамі, механізатарамі, сельскай інтэлігенцыяй. З выступлення намесніка сакратара камітэта камсамола гістфака Д. Ротмана можна зрабіць вывад, што камсамольская арганізацыя ў здзяйсненні гэтых мерапрыемстваў таксама пryme актыўны ўдзел.

Рашэнні Пленума ЦК КПСС абмяркоўваюцца ва ўсіх партарганізацыях універсітэта.

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 33 (724) Пятніца, 29 лістапада 1968 г. Год выдання XXII Цана 2 кап.



**Пройдзе некалькі месяцаў — і Роза Ленчнер будзе абараняць дыпломную работу. А пакуль што ў лабараторыі вядуцца шматлікія доследы, якія лягуць у аснову дыпломнай работы.**

**НА ЗДЫМКУ: студэнтка-выпускніца хімічнага факультэта Роза ЛЕНЧНЕР праводзіць чарговы дослед у лабараторыі. Фота І. АСКІРКІ.**

# КУРАТАР ГРУПЫ

На пасяджэнні парткома разгледжана пытанне аб кіраўніцтве партыйным бюро матэматычнага факультэта работай куратараў.

Як адзначыла камісія (С. Д. Лапцёнак, К. Р. Аперанка, Л. Н. Чаголіна, М. С. Корзун, М. П. Буглак), якая рабіла праверку на матфаку, партыйнае бюро ў персанальным парадку зацвердзіла састаў куратараў. Аднак у мінулым годзе куратары (31 чалавек стацыянара і пяць вячэрняга аддзялення) назначаліся толькі на першых трох курсах; палітыка-выхаваўчая работа на чацвёртых-пятых курсах вялася кафедрамі, на якіх студэнты праходзілі спецыялізацыю.

У бягучым навучальным годзе, імкнучыся ўзмацніць кантроль за дзейнасцю камсамольскіх і прафсаюзных груп старэйшых курсаў, надаць большую мэтанакіраванасць палітыка-выхаваўчай рабоце сярод студэнтаў, партбюро вырашыла зацвердзіць куратараў ва ўсіх групах факультэтаў.

У гэтым навучальным годзе назначаны куратарамі груп 49 выкладчыкаў на стацыянары і пяць — на вячэрнім аддзяленні. Сярод іх таварышы, якія станоўча зарэкамендавалі сябе на гэтай рабоце ў мінулыя гады: А. Н. Нахімоўская, Т. Ф. Каванава, І. А. Сакалоў, Ф. В. Чумакоў, В. Н. Русак, Н. А. Лукашэвіч, А. В. Ераксін і іншыя. Да выхаваўчай работы сярод студэнтаў актыўна прыцягваюцца А. А. Філімонаў, І. Т. Рагоўскі, Р. А. Малюковіч, Е. В. Петушкова і іншыя вопытныя выхавацелі моладзі. Вельмі часта з дакладамі, гутаркамі перад студэнтамі выступаў дэкан факультэта А. А. Гусак, нярэдка на камсамольскія сходы груп запрашаюцца прафесары і акадэмікі, якія працуюць са студэнтамі. Гэтыя таварышы робяць вельмі многае для таго, каб злучыць навучальны і выхаваўчы працэсы.

Назначаныя куратары ў асноўным адпавядаюць сваімі асабістымі якасцямі тым высокім патрабаванням, якія да іх прад'яўляюцца. У гэтым, відаць, адна з умоў таго, што на матэматычным факультэце пастаянна падтрымліваюцца абставіны працавітасці і высакароднасці, няма такіх выпадкаў, якія б выходзілі за межы паводзін студэнтаў.

Партыйнае бюро імкнецца вытрымаць такі прынцып падбору куратараў, каб да гэтай работы прыцягнуць выкладчыкаў, якія чытаюць курс лекцый або вядуць практычныя заняткі ў групе. Там жа, дзе гэта не ўдаецца, адчуваецца яўнае аслабленне зацікаўленасці куратараў да сваіх абавязкаў. Так, на другім курсе вячэрняга аддзялення быў назначан А. К. Ахраменка. Паколькі ён у гэтай групе не працаваў, то і студэнтаў не ведаў. Рэдка бываў па той жа прычыне ў групе куратар вячэрняга аддзялення А. Ф. Наумовіч.

Партыйнае бюро матфака пастаянна плануе работу куратараў. Так, у бягучым навучальным годзе прадугледжана зрабіць многа добрых і карысных спраў: правядзенне партсходу з павесткай дня «Аб становішчы палітыка-выхаваўчай работы на факультэце і мерах па яго паляпшэнню», пасяджэнняў партбюро з павесткай аб рабоце куратараў на факультэце, аб удзеле кафедр тэарэтычнай механікі і дыферэнцыяльных ураўненняў у гэтай справе, арганізацыі гутарак у групах.

У той жа час камісія адзначыла шэраг істотных недахопаў і выказала некалькі карысных прапаноў па арганізацыі работы куратараў. У цэлым кіраўніцтва партыйнага бюро матфака дзейнасцю куратараў прызнана здавальняючым.

# ЛЕКЦЫЯ І СТУДЭНТЫ

Лекцыя... У сістэме універсітэцкай асветы яна займае важнае месца. Змястоўная лекцыя па грамадскіх дысцыплінах садзейнічае выхаванню студэнтаў у духу высокай ідэйнасці, камуністычнай перакананасці, адказнасці перад Радзімай.

Мы наведалі лекцыі па навуковаму камунізму, гісторыі партыі, палітэканоміі і філасофіі. Чытаюцца яны на дастатковым ідэйна-тэарэтычным і навуковым узроўні. Навуковыя работнікі добра валодаюць дысцыплінамі, якія выкладаюць. У сваіх лекцыях побач з асноўнымі творамі Маркса і Энгельса яны выкарыстоўваюць факты з сучаснага грамадска-палітычнага жыцця, падвяргаюць крытыцы буржуазныя тэорыі.

Добра была прачытана дацэнтам А. М. Паўлючэнкам лекцыя на тэму: «Утапічны сацыялізм — тэарэтычная крыніца навуковага камунізма». Выкладанне вялося жыва, эмацыянальна. Парой лектар звяртаўся да аўдыторыі з пытаннямі, якія пабуджалі студэнтаў шукаць адказы, уважліва сачыць за далейшым развіццём тэмы. У ходзе лекцыі прыводзіліся прыклады з мастацкай літаратуры.

Даступна і пераканаўча была прачытана дацэнтам А. Я. Бураўскім лекцыя на тэму «Таварна-грашовы абарот пры сацыялізме». Тое ж можна сказаць і аб лекцыях выкладчыка І. А. Сергеева па гісторыі КПСС і дацэнта Э. Клёсавай па марксісцка-ленінскай філасофіі.

Разам з тым неабходна прызнаць, што ў святле Пастановы ЦК КПСС «Аб мерах па далейшаму развіццю грамадскіх навук і павышэнню іх ролі ў камуністычным будаўніцтве» навуковыя работнікі факультэта далёка не выкарыстоўваюць усіх магчымасцей для таго, каб падняць выкладанне грамадскіх дысцыплін на яшчэ больш высокую ступень, каб лекцыі і семінарскія заняткі сталі важнейшым сродкам палітычнага выхавання студэнта. Узяць хоць бы той факт, які знайшоў месца на трэцім курсе беларускага аддзялення. Ён сведчыць аб тым, што ў працэсе вывучэння грамадскіх дысцыплін, у першую чаргу гісторыі КПСС, не было дасягнута правільнага разумення студэнтамі нацыянальнай палітыкі нашай партыі.

Распрацоўка пытанняў, прадугледжаных вучэбнымі праграмамі, вядзецца ў такой форме, што яна не пабуджае студэнтаў да самастойнага мыслення. Паказваючы перавагу сацыялістычнага ладу перад капіталістычным, выкладчыкі абыходзяць маўчаннем пытанне аб цяжкасцях (і шляхах іх пераадолення) у сацыялістычным і камуністычным будаўніцтве.

Некаторыя лектары выкладаюць матэрыял аднатонна. Такое выкладанне эмацыянальна не ўздзейнічае на слухачоў. Упускаецца з-пад увагі, што ў лекцыі важна не толькі тое, што гаворыцца, але і як гаворыцца.

Пастанова ЦК КПСС патрабуе «удасканальваць навучальны працэс, цясней звязваць выкладанне грамадскіх навук з профілем падрыхтоўкі спецыялістаў». Між тым у лекцыях і на семінарскіх занятках, як правіла, недастаткова ўлічваецца спецыфіка філалагічнага факультэта, як факультэта гуманітарных навук, дзе займаецца моладзь, якая думае вобразна,—ілюстрацыя тэарэтычных палажэнняў прыкладамі з мастацкай літаратуры ў такой аўдыторыі асабліва неабходна.

А вось суседзі філфакаўцаў — студэнты-журналісты станоўча ацэньваюць лекцыі не па спецыяльных дысцыплінах, але якія ўмела звязаны з курсам журналісцкай практыкі. Такія лекцыі чытаюць прафесар М. М. Авакаў (асновы савецкага права), дацэнт Ю. А. Гусеў (дыялектычны матэрыялізм) і С. Д. Лапцёнак (асновы марксісцка-ленінскай этыкі).

Зніжае ўздзеянне грамадскіх дысцыплін на студэнтаў і такая немалаважная акалічнасць, як недастатковая колькасць або поўная адсутнасць нагляданых дапаможнікаў. Ні адзін з выкладчыкаў імі не карыстаецца ў час лекцый і семінарскіх заняткаў.

**Камісія партыйнага камітэта праверыла становішча выкладання грамадскіх навук на філалагічным факультэце. Гэтае пытанне было абмеркавана на пасяджэнні камітэта. Прынята разгорнутае рашэнне па паляпшэнню выканання Пастановы ЦК КПСС «Аб мерах па далейшаму развіццю грамадскіх навук і павышэнню іх ролі ў камуністычным будаўніцтве».**

А як студэнты слухаюць лекцыі, удзельнічаюць у семінарскіх занятках?

Многія прапускаюць лекцыі, не з'яўляюцца на семінары. Напрыклад, на лекцыі па філасофіі са 129 студэнтаў адсутнічаў 31, па навуковаму камунізму са 150 — 37.

Семінарскія заняткі праходзяць пры зусім недастатковай актыўнасці студэнтаў. На семінары па філасофіі прысутнічала з 29 усяго 11. І з гэтага ліку актыўна ўдзельнічалі пяць студэнтаў, астатнія дрэнна падрыхтаваліся або зусім не выступалі. Лепш прайшоў семінар па палітэканоміі. Выступленні былі змястоўнымі, прысутнічалі з 27—20 студэнтаў. Але і тут былі непадрыхтаваныя. Актыўна прайшлі семінарскія заняткі, якія праводзіў дацэнт А. А. Волк на тэму «Другі з'езд РСДРП».

Не ўсе студэнты канспектуюць творы класікаў марксізма-ленінізма. Студэнт другога курса беларускага аддзялення Казакевіч не прымушае сябе запісваць лекцыі. «Я прачытаю па кнігах, — гаворыць ён. — А да экзаменаў канспект вазьму ў сябра». Студэнтка Купрэйчык у час лекцыі чытала нейкую кнігу. На пытанне, чаму яна так абыякава да таго, аб чым гаворыць выкладчык, ніколькі не саромеючыся, адказала: «Проста так». У час лекцый нярэдка можна заўважыць такую карціну: першыя рады студэнтаў слухаюць уважліва і запісваюць, а на апошніх трох радах чытаюць кніжкі, пісьмы, размаўляюць. Гэтыя факты гавораць не толькі аб недысцыплінаванасці, але і аб абыякавых адносінах да вывучэння грамадскіх дысцыплін. Гэта асабліва недапушчальна для студэнтаў-філолагаў, будучых выкладчыкаў гуманітарных навук.

Нам здаецца, што кафедрам неабходна зноў абмеркаваць пытанне аб мерах павышэння ролі лекцый у камуністычным выхаванні студэнтаў. Трэба настойліва дабівацца, каб лекцыі і семінары вызначаліся глыбокім навуковым зместам, дакладнай палітычнай накіраванасцю, улічвалі профіль факультэта і былі эмацыянальна насычаны. Неабходна дапамога маладым выкладчыкам у павышэнні іх майстэрства як лектараў і кіраўнікоў семінарскіх заняткаў.

Пара таксама сур'ёзна абмеркаваць і вырашыць у рэктараце пытанне аб выкарыстанні наглядных дапаможнікаў і сучасных тэхнічных сродкаў у навучальным працэсе. Гэта павысіць зацікаўленасць студэнтаў да лекцый і семінараў, дапаможа ім лепш засвоіць грамадскія дысцыпліны.

Дэканату філфака, партбюро сумесна з камсамольскім камітэтам неабходна весці растлумачальную работу сярод студэнтаў аб ролі грамадскіх навук у камуністычным будаўніцтве.

**М. ЗЯРНІЦКІ,**
**дацэнт кафедры гісторыі бальшавіцкага друку.**



# ЛЕПШЫЯ Ў МІНСКУ

*Сціхлі шчырыя апладысменты мінчан — закончыўся гарадскі агляд мастацкай самадзейнасці студэнцкіх калектываў, прысвечаны 50-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі.*

*Ад нашага універсітэта ў аглядзе прынялі ўдзел народны аркестр народных інструментаў, танцавальны калектыў і студэнцкі тэатр.*

*Удзельнікі танцавальнага калектыву Аляксей Дзегцяроў, Уладзімір Дудко, Людміла Грышчанка, Таццяна Лебедзева і іншыя заваявалі сваім майстэрствам і студэнцкім задорам сімпатыі не толькі гледачоў, але і журы, па рашэнню якога калектыў узнагароджан дыпломам I ступені.*

*Аркестр народных інструментаў таксама заняў першае месца і прызнан лепшым у Мінску.*

*Немалую цікавасць гледачоў і журы выклікаў студэнцкі тэатр. Журы ўзнагародзіла дыпломам II ступені Арнольда Пятрова за выкананне ролі Алега Кашавога, дыпломы III ступені атрымалі Генадзь Безладнаў за ролю Івана Земнухава і Юра Шыкло за ролю Сяргея Цюленіна.*

*А. ПАЎЛЯНКОЎ.*

*НА ЗДЫМКУ: народны аркестр народных інструментаў у час рэпетыцыі.*

*Фота І. АСКІРКІ.*

# ЧАС БЫЎ СУРОВЫ...

## РЭВАЛЮЦЫЯЙ НАРОДЖАНЫ

Першыя гады Савецкай улады. Суровы і трывожны час. Вялікія задачы стаялі перад тымі, хто звергнуў стары свет і пачаў будаваць новы. Трэба было вучыцца ўсяму і ўсім для таго, каб выканаць гэтыя задачы.

Адкрыўся універсітэт у Беларусі — першая навуковая кузня, цэнтр стварэння нацыянальных кадраў. Медыцынскі факультэт універсітэта пачаў падрыхтоўку ўрачоў.

Камсамольская арганізацыя універсітэта — людзі, якія прайшлі рэвалюцыю, грамадзянскую вайну. Яны адчувалі вялікую адказнасць за ўсё, што адбывалася ў іх час, таму так мужна пераносілі нягоды, якія выпадалі на іх долю. Разам з тым здзіўляе шырыня работы камсамольскіх ячэек. Не было такіх спраў у рэспубліцы, да чаго б не прыкладалі свае рукі камсамольцы.

Я пазнаёмілася з матэрыяламі, якія ўдалося сабраць маім аднакурснікам, — аб рабоце камсамольскай ячэйкі медфака БДУ за 1921—1930 гады, г. зн. з часу ўтварэння БДУ і да моманту пераўтварэння медфака ў медыцынскі інстытут. Гэта, у асноўным, выпіскі з газеты «Звязда», пратаколы сходаў і пасяджэнняў бюро ячэек.

Вось факты і пытанні, на якія хочацца цяпер звярнуць увагу чытачоў, задумацца над імі, павучыцца.

Я не прыдумала нічога лепшага, як выкласці іх у храналагічным парадку з некаторымі каментарыямі. Перш за ўсё імёны і некаторыя даты. У 1921 годзе членамі бюро ячэйкі БДУ былі студэнты-медыкі Стальмашонак, Цывіна. У 1927 годзе сакратаром бюро камсамольскай арганізацыі БДУ быў студэнт медфака А. Маўшовіч. 29 красавіка 1924 года была створана самастойная камсамольская арганізацыя медфака. У састаў першага бюро ячэйкі ЛКСМБ медфака ўваходзілі Цывіна (сакратар), Коган, Якімовіч. У далейшым членамі бюро былі Валчонак, Кніга, Стальмашонак, Бірыч. У 1921 годзе медфак БДУ налічваў 11 камсамольцаў, праз чатыры гады — 75, а ў 1928 годзе — 102.

Каб будаваць новае жыццё, у краіне патрэбна было тэрмінова ліквідаваць непісьменнасць, і камсамольцы медфака вядуць гурткі лікбеза сярод рабочых, сялян падшэфнага Самахвалавіцкага раёна.

Адной з галоўных задач Савецкай улады было выхаванне падрастаючага пакалення. Камсамольская ячэйка медфака дапамагае вырашыць і гэту задачу. Камсамольцы шэфствавалі над піянерскімі арганізацыямі, у якія ўваходзілі і былыя беспрытульнікі, праводзілі канферэнцыі сярод беспартыйнай моладзі, вечары спайкі з рабочымі ячэйкамі. У лютым 1925 года, напрыклад, быў праведзен вечар спайкі з моладдзю заводаў «Энергія» і «Чырвоная зара».

Не абышлася без медфакаўцаў і такая важная справа, як удзел у арганізацыі калгасаў і саўгасаў у рэспубліцы. Камсамольцы выязджалі ў вёскі, праводзілі агітацыйную работу сярод сялян, дапамагалі ім разабрацца ў складанай грамадска-палітычнай сітуацыі. Трэба дапамагчы рэспубліцы ў страхавой рабоце — і медфак выдзяляе для гэтага 30 студэнтаў. Камсамольскі актыў дапамагае клеіць мяшкі для кааперацыі, прымае ўдзел у аказанні дапамогі бежанцам, дзяжурыць у Белэвакапрыёмніку. Усе камсамольцы медфака былі членамі МОПР. Ячэйка падтрымлівала сувязь з літоўскім камсамолам. Па рашэнню бюро ячэйкі ад 25 верасня 1924 года ў карысць літоўскіх камсамольцаў адлічвалася штомесячна па 5 капеек ад кожнага стыпендыята і 1, 2 працэнта ад зарплаты студэнтаў, якія працавалі. Гэты факт мяне чамусьці крануў больш за ўсё. І ўсё ж каб ясна адчуць цану гэтай дапамогі сябрам, трэба было, відаць, жыць у той суровы час. Але, нягледзячы ні на што, студэнты застаюцца студэнтамі — іх не пакідае задор, пачуццё гумару, уменне весяліцца ў самыя цяжкія хвіліны. У газеце «Звязда» за 7 чэрвеня 1925 года быў надрукаван верш студэнта Д. Шклоўскага, у якім ён з гумарам расказвае аб студэнцкім жыцці. Прывяду некалькі радкоў:

Встать поутру рано в шесть,<br>
Ломоть хлеба с солью съесть,<br>
По грязи (в ботинках дыры)<br>
Прошагать версты четыре.<br>
Путь, вагоны. В них дрова....<br>
Разгрузить вагона два.<br>
Если так потрудиться,<br>
Загребешь ты в день два тридцать.

Прафесар Т. В. Бірыч, адна з самых актыўных камсамолак ячэйкі медфака, успамінае аб «камсамольскіх лазнях» — сходах, прысвечаных разбору некаторых камсамольцаў, іх адносін да грамадскай работы, да вучобы, да сяброў. Сходы праходзілі вельмі цікава. Некаторых там здорава «прыпарвалі».

Захаваліся пратаколы пасяджэнняў бюро ячэйкі ЛКСМБ медфака БДУ за 1924—1925 гады. Галоўныя пытанні, якія стаялі тады ў цэнтры ўвагі, — палітасветработа, шэфства над піянерамі, правядзенне вечароў згуртавання з беспартыйнай моладдзю, работа гурткоў лікбеза, паездкі ў падшэфную вёску, садружнасць з літоўскім камсамолам, праверка палітычнай самаадукацыі камсамольцаў (у прыватнасці, чытанне газет), садружнасць з ячэйкамі Чырвонай Арміі, назначэнне стыпендый. На кожным пасяджэнні ячэйкі заслухоўваліся дзве-тры індывідуальныя справаздачы, падводзіліся вынікі выканання камсамольцамі сваіх абавязкаў.

На пасяджэннях бюро разбіраліся з усёй строгасцю просьбы беспартыйных студэнтаў аб тым, каб ім дазволілі наведваць сходы ячэйкі. Разглядаліся пытанні і аб пераходных курсавых экзаменах, пераводзе студэнта з курса на курс. Вось адно з рашэнняў: «Пакінуць трох таварышаў на другі год на першым курсе з мэтай падрыхтоўкі мінімуму, пасля чаго паставіць пытанне перад дэканатам аб пераводзе на другі курс».

На пасяджэннях бюро разглядаліся часам і заявы студэнтаў аб пераводзе на другі факультэт або ў другі інстытут. У якасці прычыны выстаўлялася адсутнасць прызвання да медыцыны. Такія просьбы звычайна задавальняліся.

Усе вечары, якія праводзіў медфак, таксама абмяркоўваліся на пасяджэннях ячэйкі, улічваліся ўсе адмоўныя і станоўчыя бакі для далейшай ацэнкі вечара. Вырашалася на пасяджэннях і мноства іншых пытанняў, якія гавораць аб тым, што ні адна справа на медфаку, у БДУ і ў рэспубліцы не праходзіла па-за ўвагай студэнтаў.

Ну, вось і ўсё. Нехта з маіх сяброў прадоўжыць напісанне гісторыі. Гэта вельмі добра, што будзе напісана такая гісторыя, бо нельга па-сапраўднаму ісці наперад, не ведаючы мінулага.

А камусьці ж пісаць гісторыю нашых дзён! У нас жа таксама многа слаўных спраў, і мы стараемся быць дастойнымі тых, хто даручыў нам працягваць вялікія справы, распачатыя ў нашай краіне ў першыя гады Савецкай улады.

**Т. ЛІШЫК.**

## КЛОПАТЫ АБ МАЙСТЭРСТВЕ

Студэнты гістфака прымаюць актыўны ўдзел у лекцыйнай прапагандзе сярод працоўных рэспублікі. Толькі за дзесяць месяцаў гэтага года па юбілейнай тэматыцы імі было прачытана звыш трохсот дакладаў амаль ва ўсіх раёнах Беларусі. Дэканат, партбюро пастаянна клапоцяцца аб падрыхтоўцы студэнтаў да выступленняў і павышэнні іх лекцыйнага майстэрства. З гэтай мэтай на факультэце арганізаван пастаянна дзейнічаючы семінар для лектараў-паліт-інфарматараў. У дапамогу ім выкладчыкі факультэта рыхтуюць матэрыялы. Факультэцкая група таварыства «Веды» пасля рэдагавання і дапаўненняў спецыялістаў размнажае гэтыя матэрыялы на ратапрынце.

Каштоўную ініцыятыву праявіў прафесар М. Я. Шкляр, які падрыхтаваў у працэсе чытання спецкурса па гісторыі КПСС групу дакладчыкаў у трыццаць чалавек па тэме «50 год БССР і КПБ».

Лектараў - студэнтаў гістфака ахвотна запрашаюць работнікі сталічных прадпрыемстваў, школ і ўстаноў. Добрыя водзывы ад слухачоў паступаюць на лекцыі студэнтаў Ю. Шынкара, А. Зелянкова, У. Кузьмінава і іншых. У час канікул студэнты-гісторыкі выступяць ва ўсіх абласцях рэспублікі.

**Г. ДАЎГЯЛА,**
дацэнт гістфака.




**● Пераможцамі гарадскога агляду мастацкай самадзейнасці сталі нашы студэнты. ● Лепшымі ў Мінску прызнаны народны аркестр народных інструментаў, танцавальны калектыў і студэнцкі тэатр ● Перагортваючы старонкі гісторыі універсітэта ● Па ініцыятыве прафесара ● Метадычная работа на гістфаку ● «Узлётаўцы» на новым узлёце.**

## ПРАВІЛЬНЫ КІРУНАК

Навукова - метадычныя камісіі гістфака дабіліся вялікіх поспехаў у рабоце. Аб гэтым падрабязна гаварылася днямі на пасяджэнні вучонага савета факультэта. У сваім выступленні дэкан гістфака П. З. Савачкін расказаў аб вопыце работы камісій, якія ўзначальваюць прафесары Г. М. Ліўшыц, Ф. М. Нячай і дацэнт Д. Б. Мельцэр. Пад іх кантролем знаходзіцца кожны студэнт. Дарэчы, студэнты, якія праяўляюць недысцыплінаванасць або пачынаюць дрэнна вучыцца, вызываюцца са справаздачамі на камісіі. Выкладчыкі строга прыцягваюць да адказнасці за любую правіннасць. Але справа не толькі ў кантролі. Метадычныя камісіі аказваюць групам і курсам вялікую дапамогу.

Выступіўшыя на вучоным савеце прафесары Л. С. Абецэдарскі, Л. М. Шнеерсон, Ф. М. Нечай і іншыя падкрэслілі неабходнасць разнастаіць работу кожнай камісіі. Характар гэтай работы павінен вызначацца не толькі чытаемымі на курсе лекцыямі, але і адносінамі студэнтаў да вучобы, грамадскай дзейнасці. Да таго ж дэканат павінен падтрымліваць прапановы навукова-метадычных камісій, вывучаць і распаўсюджваць перадавы вопыт. У гэтым ёсць неабходнасць, таму што на гістфаку цяпер створана чатырнаццаць курсавых навукова-метадычных камісій. Абмеркаванне вынікаў іх работы на вучоным савеце сведчыць аб вялікай увазе ўсяго факультэта да пытанняў методыкі.

**Я. АСІПКОЎ,**
кандыдат эканамічных навук.

# БОЛЬШ ЛІРЫЧНАЙ СТАЛАСЦІ

Цяпер, калі, па выказванню Я. Еўтушэнкі, «вершы чытае амаль не ўся Расія, і амаль не паў-Расіі піша іх», вну без якой-небудзь сваёй літаратурнай арганізацыі — з'ява даволі рэдкая.

Паэтычнае аб'яднанне «Узлёт», створанае некалькі год таму назад пры газеце «Беларускі універсітэт», апраўдвае сваю прыгожую назву. Гэта сапраўды ва ўсіх адносінах стартавая пляцоўка таленавітай моладзі — два ўжо выдадзеныя ўзлётаўцамі зборнікі гавораць самі за сябе.

Аб кваліфікацыі гэтага творчага калектыву можна меркаваць хоць бы нават па тым уражанні, якое пакінуў пасля сябе вечар паэзіі, арганізаваны сіламі ўзлётаўцаў у актавай зале філалагічнага факультэта 23 лістапада.

Тут дэбютавалі галоўным чынам пачынаючыя. Вершы, якія прагучалі на вечары, мелі пэўны поспех, які, відаць, не змераеш адным толькі пачуццём такту шматлікай аўдыторыі.

Маладыя аўтары выявілі бясспрэчнае ўменне выкладаць думкі свабоднай гутарковай мовай і разам з тым аранжыраваць і думкі і пачуцці арыгінальнымі мастацкімі асацыяцыямі, уменне развіваць псіхалагічныя каштоўнасці ў гарманічныя канцэпцыі. Усё гэта яўныя прыкметы паэтычнага даравання, і яны, вядома, прынеслі слухачам вялікае задавальненне.

Жаночая лірыка вызначана смуткам нейкай асаблівай прыгажосці, якая, відаць, нікольկі не залежыць ад сталай таленавітасці. Пасля выступленняў Галіны Каржанеўскай, Алены Руцкай і Жэні Янішчыц мне міжволі прыйшлося падумаць аб гэтым яшчэ раз.

Калі ў цябе за плячыма некалькі год больш ці менш інтэнсіўнай тэарэтычнай работы і калі цябе прыцягвае да такой маштабнай тэмы, як тэма Радзімы,—значыць ты нарадзіўся не без «божай іскры», і ўжо не за гарамі твая творчая сталасць. Гэту ўжо выверануло ісціну я ў якасці кампліментa адрасую Аляксандру Камароўскаму, аўтару маленькай паэмы «Зямля мая».

У вершах Мар'яна Дуксы, я б сказаў, ужо адчуваецца нешта ад упэўненасці улады маёмаснага. Дукса свабодна валодае душой верша — інтанацыяй. Беспамылковае адчуванне інтанацыі, якая выказвае ідэю, і форма, якая адпавядае інтанацыі, развітае адчуванне стылю, ядраная мова—з такімі якасцямі Мар'яну Дуксе не грэх падумаць і аб больш высокіх жанрах.

І ў заключэнне мне хочацца пажадаць усім узлётаўцам яшчэ большай лірычнай сталасці, якой адвеку вызначаецца вялікая паэзія, той смеласці, якая, як ніхто іншае, узбагачае змест і форму, выгравіроўвае паэтычную індывідуальнасць і з'яўляецца амаль асноўнай крыніцай лагічнай улады паэтычнага слова.

**В. ДУДКО.**

# НА СПАТКАННЕ З ПРЫРОДАЙ



НА ЗДЫМКУ: гаспадыня аранжарэі А. Н. Назулька.

Фота І. Аскіркі.

Раздарыла людзям усе свае яркія фарбы залатая восень, вымылася дажджамі і упрыгожылася снегам зямля, і надоўга, да вясны развітаўся чалавек з добрымі зялёнымі сябрамі.

Але аматары прыроды скарачаюць гэты тэрмін. Адны ідуць на спатканне з ёй у далёкі лес, іншыя—да акварыумаў і птушыных клетак, трэція чэрпаюць гэту радасць каля прылаўкаў магазіна кветак або дома, любуючыся хатнімі раслінамі. Мы сёння хочам запрасіць вас ва універсітэцкую аранжарэю.

Заглянем у гэты ціхі, цудоўны куток, які прытуліўся пад самым дахам біялагічнага корпуса. Ужо з парога цябе ўражвае багацце свежай, сакавітай, магутнай зелені. Вочы разбягаюцца — што ж глядзець спачатку? І тут на дапамогу прыходзіць гаспадыня гэтага зялёнага царства Анастасія Дзмітраўна Назулька. Гэта дзякуючы яе нястомным клопатам на плошчы ў 70 метраў так выдатна сябе адчуваюць сотні самых разнастайных раслін. Сярод іх пануючае месца займаюць раскошныя пальмы. Вось адна сваімі бліскучымі тугімі стрэламі лісцяў упіраецца ў шкляную столь і нібы заглядвае праз клятчатыя пераплёты акон на сумную зімовую вуліцу. А навокал гэтых пальм на стэлажах і падаконніках, на розных палічках, падстаўках у вялікіх скрынках і маленькіх гаршчочках, нібы спаборнічаючы адзін з другім прыгажосцю або незвычайнай формай лісцяў, зачароўваюць погляд бягоніі і амарылісы, клівіі, лаўровыя дрэўцы, кіпарысы... На самым светлым і сухім месцы — калонія кактусаў. Раней гэтыя голыя і калючыя расліны не выклікалі маёй сімпатыі, а цяпер я доўга не магу адыйсці ад іх, стараюся адшукаць аднолькавыя экземпляры — і не знаходжу: разеткі, выгнутыя дрэўцы, збаночкі. А вось нібы хто ўваткнуў у зямлю дубец — такое ўражанне выклікае доўгая шэра-зялёная сцябліна, канец якой свабодна павіс у паветры.

Што ні крок — дык нешта новае для недасведчанага аматара: побач з парасончыкамі папірусаў і знаёмай папараццю распусціў круглае цёмна-зялёнае лісце чорны перац. Прыемнае ўражанне выклікае суквецце панкрацыума на доўгай ножцы, прыцягвае да сябе яркімі ягадамі ігліца, а вось сапраўдная акацыя з маленькімі лісцямі і мяцёлкамі кветак.

Свецяцца сонечнымі капелькамі фіялетавыя вочы фіялак. А вымушаная быць экскурсаводам Анастасія Дзмітраўна без стомы расказвае, адкуль паявіліся расліны, як яны цвітуць, якім валодаюць характарам. Сама вялікі аматар кветак, яна, сталая жанчына, з юнацкім захапленнем расказвае, якой незвычайнай прыгажосці расцвілі ў самай сярэдзіне мінулай зімы у яе цюльпаны! Які незвычайна моцны пах жасміна, і Анастасія Дзмітраўна паказвае маленькія чаранкі гэтай расліны...

Экскурсія наша зацягнулася на дзве гадзіны, а выходзіць не хочацца.

Я распытваю Анастасію Дзмітраўну аб умовах яе работы. І тут становіцца зразумелым, як цяжка часамі ўдаецца паліваць і апырскваць расліны: то няма вады, то напор яе недастатковы, як патрэбны ў яе гаспадарцы розных памераў гаршкі для кветак, ад самых маленькіх да вялікіх, як часамі няўважлівасць да патрэб аранжарэі ўскладняе і да таго нялёгкую яе працу.

Я пакідала аранжарэю, асцярожна несучы кволую, шчодра пахнучую маленькую кветку жасміну, і мне вельмі хацелася, каб сабраная тут прыгажосць радавала як мага больш людзей, каб добрыя падарункі Анастасіі Дзмітраўны — цудоўныя расліны — упрыгожвалі не толькі ўніверсітэцкую канцылярыю, бібліятэку, бухгалтэрыю, але і рассяліліся па іншых памяшканнях, а клопаты гаспадыні аранжарэі падзялілі тыя, хто можа і павінен аблегчыць яе працу.

А. АЛЕНІЧ.

# СКАРБЫ ДА ВАШЫХ ПАСЛУГ

**У фондах універсітэцкай бібліятэкі налічваецца больш 800000 кніг, брашур, перыядычных выданняў, часопісных камплектаў, а яе калектыў абслугоўвае больш 17000 чытачоў. Натуральна, што пры вялізным фондзе і вялікай нагрузцы работнікі абанементнага аддзела і чытальных залаў не могуць задаволіць усе запатрабаванні наведвальнікаў. Вядома, калі вы просіце канкрэтнае выданне, г. зн. ведаеце аўтара кнігі і яе назву, нумар і год выдання патрэбнага часопіса, дык можна непасрэдна звяртацца ў аддзелы выдачы. Але і ў такім выпадку неабходна даведацца па алфавітнаму каталогу, ці ёсць гэта кніга у бібліятэцы, і ўказаць яе шыфр.**

**Наяўнасць часопісаў устанаўліваецца па часопіснай картатэцы. Бывае, што чытачу трэба падабраць літаратуру па тэме, удакладніць бібліяграфічныя даныя аб кнізе або часопісным артыкуле (аўтара, назву, год выдання, у якім часопісе апублікаван артыкул і г. д.) З такімі пытаннямі трэба звяртацца ў даведніцка-бібліяграфічны аддзел бібліятэкі, які аказвае дапамогу ўсім чытачам у падборы літаратуры, інфармуе аб новых паступленнях, дае кансультацыі па пытаннях методыкі самастойнага падбору літаратуры з дапамогай каталогаў, даведнікаў і бібліяграфічных указальнікаў.**

**Дзяжурны бібліёграф дапамагае чытачам вызначыць тыя крыніцы, па якіх можна знайсці патрэбную літаратуру; пры неабходнасці вучыць правільна выпісваць кнігі і часопісныя артыкулы з каталогаў і картатэк, карыстацца бібліяграфічнымі і даведніцкімі выданнямі.**

**Вялікую дапамогу ў падборы літаратуры аказваюць бібліятэчныя каталогі і картатэкі. Каталогі адлюстроўваюць наяўнасць кніг у данай бібліятэцы. Асноўнымі каталогамі бібліятэкі універсітэта з'яўляюцца алфавітны і сістэматычны. Па алфавітнаму каталогу можна ўстанавіць наяўнасць у бібліятэчным фондзе патрэбнай кнігі і яе шыфр. Пры падборы літаратуры па неабходнай тэме трэба звяртацца да сістэматычнага каталога, які знаходзіцца ў памяшканні даведніцка - бібліяграфічнага аддзела. Для лепшага задавальнення запатрабаванняў чытачоў даведніцка - бібліяграфічны аддзел мае падсобны фонд літаратуры, які ўключае даведніцкія (энцыклапедыі, слоўнікі, даведнікі) і бібліяграфічныя выданні.**

**Для падрыхтоўкі дакладаў, семінарскіх заняткаў, экзаменаў, для работы ў гуртках СНТ чытачу патрэбна літаратура па многіх пытаннях. Напрыклад, матэрыялы ў дапамогу вывучаючым работу У. І. Леніна «Што рабіць!», падручнікі па матаналізу, літаратура па старажытнаму свету, ультрагуку, хімічнай кінетыцы, геафізіцы, генетыцы, заагеаграфіі і г. д. З усімі такімі пытаннямі трэба звяртацца да дзяжурнага бібліёграфа даведніцка - бібліяграфічнага аддзела, які з дапамогай сістэматычнага каталога, картатэк часопісных артыкулаў і даведніцкага фонда літаратуры дапаможа чытачам падабраць патрэбныя матэрыялы і адказаць на разнастайныя пытанні, звязаныя з творамі друку.**

**Для азнаямлення чытачоў з новай літаратурай даведніцка-бібліяграфічны аддзел штомесячна выпускае «Бюлетэнь новых паступленняў», які інфармуе аб кнігах, паступіўшых у бібліятэку на працягу месяца. Такі бюлетэнь ёсць у даведніцка-бібліяграфічным аддзеле бібліятэкі на ўсіх пунктах выдачы і на ўсіх факультэтах.**

**Даведніцка - бібліяграфічны аддзел знаходзіцца ў галоўным корпусе на другім паверсе (п. 223) і абслугоўвае чытачоў штодзённа, акрамя нядзелі, з 9 да 19 гадзін. Па суботах да 18 гадзін.**

**Л. ПЯЛЕВІНА, старшы бібліёграф.**

**НА ЗІМОВЫХ ТРАСАХ.**

**Фота І. Аскіркі.**



## Спорт

## ВЫДАТНЫ СТАРТ

Паспяхова стартавала ў круглагадавой спартакіядзе каманда мясцкома, якая састаіць з выкладчыкаў і аспірантаў універсітэта. На прайшоўшых спаборніцтвах па вольнай барацьбе і футболу каманда заняла першае месца. Актыўны ўдзел у арганізацыі каманд прымаюць супрацоўнікі фізфака І. С. Монак і Д. Н. Саковіч.

## НАШЫ ВАЛЕЙБАЛІСТЫ — ЧЭМПІЁНЫ РЭСПУБЛІКІ

З 15 па 22 лістапада ў г. Гомелі праводзіўся чэмпіянат БССР па валейболу, прысвечаны 50-годдзю БССР і КПБ. У гэтых спаборніцтвах удзельнічалі прызёры горада Мінска — мужчынская і жаночая каманды універсітэта і зборныя каманды абласцей. Нягледзячы на тое, што нашы прызёры ўпершыню прымалі ўдзел у такіх спаборніцтвах, яны выступілі паспяхова: мужчынская і жаночая каманды БДУ імя У. І. Леніна выйгралі ва ўпорнай барацьбе першае месца. Перамога прыйшла нялёгка: каманду нашых дзяўчат па пятах праследавала жаночая каманда гомельскага «Лакаматыву». Аднак гамяльчане не вытрымалі напору барацьбы і, прайграўшы камандзе Гродзенскай вобласці, вымушаны былі задаволіцца другім месцам.

У мужчын за першае месца вялі паядынак спартакаўцы Віцебска і студэнты універсітэта. Уперадзе на адно ачко былі нашы рабяты. Апошні дзень не прынёс змяненняў у табліцу розыгрышу: абедзве каманды, прайграўшы сваім сапернікам, захавалі розніцу ў адно ачко, і віцябляне першымі павіншавалі студэнтаў з тытулам чэмпіёнаў БССР.

А вось хто абараняў гонар універсітэта: Т. Турганава — III хімфак, В. Трахіменка — IV матфак, О. Сачкіна — I матфак, Л. Дубовік — I матфак, Т. Біч — II гістфак, Л. Макарава — II біяфак, А. Шаўчуган — III фізфак. У мужчын: В. Жураўлёў — гістфак, В. Пісараў — гістфак, В. Рабаў — юрфак, А. Ліпковіч — юрфак, В. Мішэнін—матфак.

В. ЯКАНЕН.

## ПЕРШЫНСТВО УНІВЕРСІТЭТА

**У мінулую суботу закончыўся першы тур першынства універсітэта па фехтаванню. Спаборніцтва на рапірах выйграў студэнт трэцяга курса матэматычнага факультэта Леанід Дудкін, другое месца заняў інжынер кафедры электрафізікі, майстар спорту Марк Ліўшыц, а на трэцім аказаўся другакурснік з хімфака Уладзімір Партноў.**

**У баях на шаблях мацнейшым паказаў сябе Марк Ліўшыц, за ім занялі месцы выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту Леанід Рабчыкаў і студэнт другога курса фізічнага факультэта Яўген Шадскі.**

**Спаборніцтвы на шпагах з вялікай перавагай выйграў студэнт другога курса біялагічнага факультэта Аляксандр Нечапурэнка, другое месца таксама дасталося фізфакаўцу — першакурсніку Мікалаю Собалеву, а трэцяе заняў студэнт трэцяга курса матэматычнага факультэта Фёдар Яско. У дзяўчат на першае месца выйшла студэнтка вячэрняга аддзялення фізфака Тацяна Васільева, два астатнія прызавыя месцы дасталіся матфакаўцам — чацвёртакурсніцы Жане Петуховай і трэцякурсніцы Тацяне Васючковай.**

**Размяшчэнне факультэцкіх каманд наступнае: матэматыкі, фізікі, каманда мясцкома, біёлагі, прадстаўнікі геолага-геаграфічнага факультэта, філолагі.**

**В. ХРЭНАЎ.**

Рэдактар М. І. ІОСЬКА.

## ПАВАЖАНЫЯ ТАВАРЫШЫ!

*Калі вы жадаеце лепш ведаць жыццё свайго універсітэта, быць у курсе навуковых дасягненняў беларускіх вучоных, раім вам выпісаць на 1969 год «ВЕСНІК БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА».*

*Падпіска прымаецца без абмежавання ўсімі агенцтвамі «Саюздруку», аддзяленнямі сувязі і грамадскімі распаўсюджвальнікамі друку.*

*ПАДПІСНАЯ ЦАНА: поўны камплект на год (12 нумароў) — 9 руб. 60 кап.*

*Асобная серыя на год (3 нумары) — 2 руб. 40 кап.*

*Цана аднаго нумара — 80 кап.*

АТ 18681 Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон: Б-2-07-19. Тыраж 2000 экз. Зак. 2011.